# Кандрат Крапіва



Кандрат Крапіва, сапраўдна : Кандрат Кандратавіч Атраховіч (5 сакавіка 1896, в. Нізок, цяпер Уздзенскі раён — 7 студзеня 1991, Мінск) — беларускі пісьменнік, паэт, сатырык, драматург, перакладчык, грамадскі дзеяч, літаратуразнавец.



Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе ў вёсцы Нізок, уздзенскім народным вучылішчы, 4-класным гарадскім вучылішчы ў Стоўбцах, з якога перавёўся ў такое ж вучылішча ў Койданава (цяпер г. Дзяржынск). Пасля заканчэння ў 1913 здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка[1]. Восенню 1914 атрымаў месца настаўніка ў пачатковай земскай школе ў вёсцы Мнішаны на Міншчыне[1]. Адпрацаваў год і быў мабілізаваны ў армію для ўдзелу ў Першай сусветнай вайне[1]. У сакавіку 1916 года скончыў Гатчынскую школу прапаршчыкаў[2]. Удзельнічаў у баях на Румынскім фронце(руск.) бел.. Як настаўнік у лютым 1918 дэмабілізаваны. Настаўнічаў у вёсцы Каменка на Уздзеншчыне. У 1920—1923 — камандзір у Чырвонай Арміі[1]. З 1924 зноў настаўнічаў на Уздзеншчыне ў пасёлку Астравок.



У 1925 пераехаў у Мінск. Быў членам літаб'яднання «Маладняк» (да 1926), потым «Узвышша». Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ ў 1930[1]. Працаваў інструктарам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце (1925—1926)[1], загадчыкам аддзела ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» (1932—1936)[1]. Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь (1939), у савецка-фінскай вайне (1939—1940)[1]. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў у франтавых газетах «За Савецкую Беларусь», «Красноармейская правда»[1], у 1943—1945 рэдагаваў сатырычную газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1945—1947 — рэдактар часопіса «Вожык»[1], у 1947—1952 загадчык сектара мовазнаўства Інстытута мовы і літаратуры АН БССР[1], дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР (1952-1956)[1].





У 1946 у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце I сесіі Генеральнай асамблеі ААН. У 1956[1] — студзені 1982 — віцэ-прэзідэнт АН БССР. Са студзеня 1982 па сакавік 1989 — вядучы навуковы супрацоўнік-кансультант у аддзеле лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Доктар філалагічных навук, акадэмік АН БССР. Неаднаразова абіраўся дэпутатам (1947—1990), старшынёй ВС БССР. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1934).
Памёр 7 студзеня 1991, пахаваны на Усходніх могілках Мінска.





# Навуковая дзейнасць

- Аўтар літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, лінгвістычных прац, адзін з навуковых рэдактараў (з Я.Коласам і П.Глебкам) «Русско-белорусского словаря» (1953), навуковы рэдактар «Беларуска-рускага слоўніка» (1962, выданне 2-е перапрацаванае і дапоўненае ў 1988—1989), «Русско-белорусского словаря» (выданне 2-е, перапрацаванае і дапоўненае, 1982), «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» ў 5 тамах (1977—1984) і інш. Выбітны знаўца беларускай мовы, Крапіва ўзначальваў Тэрміналагічную камісію Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, непасрэдна займаўся распрацоўкай тэрміналогіі ў розных галінах навукі. Кандрат Крапіва — акадэмік НАН Беларусі, доктар філалагічных навук.
- Разам з Р. І. Аванесавым і Ю. Ф. Мацкевіч выпусціў працу «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968—1969)[1].

# Узнагароды

- Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў і медалямі. Народны пісьменнік БССР (1956). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1978). Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР: у 1941 за п'есу «Хто смяецца апошнім», у 1951 за п'есу «Пяюць жаваранкі», у 1971 — за комплекс прац у галіне беларускай лінгвагеаграфіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1974) за п'есу «Брама неўміручасці».

# Памяць

- Пра Кандрата Крапіву створаны дакументальны фільм «Кандрат Крапіва» (1983, рэж. М. Купеева)[2]
- У гонар Кандрата Крапівы названы Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ИИЭФ) Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Уздзенская сярэдняя школа № 2[2]
- У Мінску на доме № 76 па праспекце Незалежнасці, у якім жыў пісьменнік, устаноўлена мемарыяльная дошка[2]
- У 1996 годзе ў гонар Кандрата Крапівы ў Беларусі выпушчана паштовая марка
- Імя Кандрата Крапівы носяць вуліцы ў Мінску і Уздзе [2]


1000
БЕЛАРУСЬ 1996
BELARUS 1996
КАНДРАТ
КРАПІВА
1896 • 1991








ПРОПУСК 178
Авхимович Н. Е.
на Цэнтральную плошчу
У ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ
ПРАЦОЎНЫХ 1 МАЯ 1977 года
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ТРЫБУНА
ЛЕВЫ СЕКТАР
МІНСК-
ГОРАД
ГЕРОЙ!